Nacionalinė švietimo agentūra

2025

# BALTARUSIŲ TAUTINĖS MAŽUMOS GIMTOJI KALBA IR LITERATŪRA

Valstybinio brandos egzamino II dalies užduotis
Pagrindinė sesija

2025 m. birželio 18 d. Trukmė – 4 val. (240 min.)

**NURODYMAI**

1. Gavę užduoties sąsiuvinį ir atsakymų lapą, pasitikrinkite, ar juose nėra tuščių lapų arba kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
2. **Atsakymų lape įrašykite savo identifikavimo kodą, grupę, vietą (eilės numerį protokole) ir pasirašykite.**
3. Atsakymų lape atsakymus rašykite tik jiems skirtose vietose. Už ribų parašyti atsakymai nebus vertinami.
4. Saugokite atsakymų lapą (neįplėškite ir nesulamdykite). Sugadintuose atsakymų lapuose įrašyti atsakymai nebus vertinami.
5. Atsakymus į užduoties klausimus ir rašto darbą pirmiausia galite rašyti užduoties sąsiuvinyje. Jei neabejojate dėl atsakymo, iš karto rašykite atsakymų lape.
6. Pasilikite pakankamai laiko rašto darbui perrašyti į atsakymų lapą, jeigu pirmiausia rašote juodraščiui skirtose vietose. **Vertintojams bus pateikiamas tik atsakymų lapas!**
7. Atsakymų lape rašykite **juodai arba mėlynai** rašančiu tušinuku aiškiai ir įskaitomai. Suklydę atsakymą galite taisyti atsakymų lape nurodytoje vietoje. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima.
8. Atlikite testą (1–23 užduotis) ir atsakymus perrašykite į atsakymų lapą.
9. Parašykite ne mažiau kaip 300 žodžių apimties rašto darbą, kaip numatyta Kalbų valstybinių brandos egzaminų užduočių apraše. Atsakymų lape suskaičiuokite rašto darbo žodžius ir paraštėje nurodykite minimalaus žodžių skaičiaus (300 žodžių) ribą. Už trūkstamą rašto darbo apimtį vertinant bus atimami taškai.
10. Visame darbe neturi būti užrašų ar kitokių ženklų, kurie leistų atpažinti darbo autorių (pavyzdžiui, vardo, pavardės, mokyklos ir kt.).
11. Pasibaigus egzaminui, užduoties sąsiuvinį galite pasiimti.

Linkime sėkmės!

© Nacionalinė švietimo agentūra

**TESTAS** (*30 taškų*)

**Прачытайце тэксты А і Б і выканайце заданні 1–23.**

**Тэкст А**

**Мова і глабалізацыя**

2 тысячы гадоў назад на зямлі было каля 12 тысяч моў, у канцы першага тысячагоддзя ўжо 10 тысяч, да пачатку XV стагоддзя 9 тысяч, а ў канцы XX стагоддзя засталося толькі 6 тысяч. Відавочна, што гэты аб'ектыўны працэс будзе паскарацца. Па прагнозах спецыялістаў, у сувязі з глабалізацыяй штогод будуць знікаць у сярэднім 12 моў і ўжо да канца XXI стагоддзя іх застанецца не больш за 600.

Па ініцыятыве ЮНЕСКА ў канцы 90-х гадоў у Парыжы быў выдадзены Атлас моў свету, а таксама складзена Чырвоная кніга моў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення і ў хуткім часе могуць стаць мёртвымі. Так, у Еўропе пад пагрозай знікнення знаходзяцца 50 моў і гаворак, сярод якіх дацкая мова, у якой найбольшая колькасць галосных гукаў (ажно 18), адна са старэйшых моў Еўропы – мова баскаў, якой ужо 5 тысяч гадоў. Далёка не самае спрыяльнае становішча з ірландскай мовай. Яе актыўна выкарыстоўвае ўсяго толькі 50 тысяч чалавек.

Найбольш тыповымі прычынамі, па якіх тая ці іншая мова аказваецца на мяжы выжывання, укладальнікі сусветнага Атласа моў называюць выпадкі, калі носьбіты той ці іншай мовы знаходзяцца ў культурнай і моўнай меншасці, уступаюць у кантакт з эканамічна моцнай культурай, а таксама ігнараванне мовы на ўзроўні сям'і.

Па меркаванні спецыялістаў, кожная мова можа трапіць у зону лінгвістычнага бедства, калі ў той ці іншай супольнасці яе перастануць вывучаць больш за 30% дзяцей.

Чым пагражае знікненне моў для чалавецтва? Пра гэта гаварылася і ў XIX стагоддзі, пра гэта гаворыцца і сёння. Напрыклад, нямецкі філолаг Ганс Юрген Зассэ лічыць, што "*са знікненнем мовы скарачаецца мудрасць і інтэлектуальнае багацце чалавецтва*". Яго падтрымлівае навуковец з Оксфарда Марк Пейгл, які адзначае, што "*чым больш моў загіне, тым раней іх патэнцыяльныя носьбіты пяройдуць на стандартную англійскую, нямецкую ці французскую, тым больш абмежаванымі і непрыгожымі будуць гэтыя мовы*". А прафесар Марон Форт з Ольдэнбурга, што на поўначы Германіі, падкрэслівае, што ў гэтай сувязі можа знікнуць нават такое паняцце, як граматнасць. Таму народы і ўрады змагаюцца за чысціню сваіх моў.

Барацьба за мову заўсёды была няпростая. У некаторых краінах змаганне набывала нават экстрэмальны характар. Так, у 1952 годзе ў Бангладэш (былы Усходні Пакістан) прымусова была ўзведзена мова *урду* замест роднай мовы *бангла*. Гэта выклікала пратэст насельніцтва і перш за ўсё студэнцкай моладзі. Падчас хвалявання пяцёра студэнтаў былі застрэлены паліцыяй. У адказ актывізаваўся нацыянальна-вызваленчы рух, які прывёў да аддзялення Усходняга Пакістана і стварэння новай дзяржавы Бангладэш. А тыя пяць хлопцаў, што загінулі за сваю мову, сталі ў Бангладэш нацыянальнымі героямі і пакутнікамі. З таго часу кожны год 21 лютага на плошчы збіраюцца тысячы людзей у знак павагі да тых, хто загінуў за родную мову. Цяпер мове *бангла* знікненне не пагражае. А ў 2000 годзе ЮНЭСКА прыняла пастанову аб наданні дню 21 лютага міжнароднага статусу і зацвярджэнні яго як Дня роднай мовы. У гэтай пастанове ўсе мовы абвешчаны роўнымі, у

ёй прагучаў заклік зберагчы кожную мову, як жывую і найкаштоўнейшую спадчыну народаў.

Ул. І. Кулiковіч. Творчыя конкурсы алімпіяды. Мінск, 2011.

**1.** Што (якія факты) сведчыць пра тое, што працэс знікнення моў хвалюе грамадства ва ўсім свеце?

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**2.** Злучыце даты і колькасць моў, якія існавалі ці будуць існаваць у абазначаны перыяд.

| | |
|---|---|
| **1)** 2000 гадоў назад | **А** 9 000 моў |
| **2)** у канцы першага тысячагоддзя | **Б** 6 000 моў |
| **3)** да пачатку XV ст. | **В** 10 000 моў |
| **4)** у канцы XX ст. | **Г** каля 12 000 моў |
| **5)** да канца XXI ст. | **Д** не больш за 600 моў |

*(1 бал)*

**3.** Што, на думку спецыялістаў, у наш час з’яўляецца прычынай змяншэння колькасці моў?

______________________________________________

*(1 бал)*

**4.** Калі, паводле тэксту, пачала ўздымацца праблема знікнення моў?

______________________________________________

*(1 бал)*

**5.** Найбольш тыповымі прычынамі, па якіх тая ці іншая мова аказваецца на мяжы выжывання, укладальнікі сусветнага Атласа моў называюць выпадкі (знакам + пазначце правільныя адказы):

| Прычына | + |
|---|---|
| **1)** Носьбіты той ці іншай мовы ўступаюць у кантакт з эканамічна моцнай культурай. | |
| **2)** Носьбіты той ці іншай мовы знаходзяцца ў культурнай і моўнай меншасці. | |
| **3)** Мова мае занадта складаную граматыку. | |
| **4)** Носьбіты мовы часцей за ўсё жывуць у гарадах. | |
| **5)** Ігнараванне мовы на ўзроўні сям’і. | |
| **6)** Мова не мае пісьмовай формы. | |

*(2 балы)*

**6.** Галоўная думка тэксту:

______________________________________________

*(1 бал)*

**7.** Якая праблема ўздымаецца ў тэксце?

______________________________________________

*(1 бал)*

**8.** Вызначце стыль тэксту.

______________________________________________

*(1 бал)*

**9.** Запоўніце табліцу, падбіраючы да кожнага стылю яго асаблівасці.

| **Стылі** | **Асаблівасці стыляў** |
|---|---|
| **1)** Публіцыстычны | |
| **2)** Мастацкі | |
| **3)** Навуковы | |

*пабуджальныя сказы, рытарычныя пытанні; адсутнасць слоў з пераносным значэннем; эмацыянальнае ўздзеянне на чытачоў; індывідуалізаванасць; уздзеянне на чытача праз мастацкія вобразы; адсутнасць вобразнасці; ужыванне абстрактнай і грамадска-палітычнай лексікі; наяўнасць аўтарскіх неалагізмаў; падкрэсленая лагічнасць і доказнасць*

*(3 балы)*

**10.** Расстаўце сказы ў правільным парадку (у адпаведнасці з тэкстам):

**А** Узнікла дзяржава Бангладэш.
**Б** Загінулі пяць студэнтаў.
**В** Пачаліся хваляванні насельніцтва.
**Г** Актывізаваўся нацыянальна-вызваленчы рух.
**Д** Прымусова была ўзведзена мова *урду.*

*(1 бал)*

**11.** Пра якія спосабы захавання моўнай разнастайнасці не гаворыцца ў тэксце (знакам + пазначце правільныя адказы)?

| **Спосаб захавання мовы** | **+** |
|---|---|
| **1)** Выданне Чырвонай кнігі моў, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення. | |
| **2)** Адукацыя. | |
| **3)** Увядзенне курсаў роднай мовы ў дзіцячых садках. | |
| **4)** Стварэнне мабільных дадаткаў для вывучэння рэдкіх моў. | |
| **5)** Сямейныя традыцыі. | |
| **6)** Заклікі да захавання кожнай мовы як спадчыны народа. | |
| **7)** Пераклады класічных твораў сусветнай літаратуры на мовы, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення. | |

*(2 балы)*

**12.** Што, па меркаванні спецыялістаў, дапаможа мове не трапіць у зону лінгвістычнага бедства?

____________________________________________________________

*(1 бал)*

**13.** Якую пагрозу (паводле тэксту) літаратурным ("стандартным") англійскай, нямецкай, французскай мовам нясе пераход на іх іншых народаў?

____________________________________________________________

*(1 бал)*

**14.** Што дзень 21 лютага сімвалізуе для розных народаў свету?

____________________________________________________________

____________________________________________________________

*(1 бал)*

**15.** Злучыце паміж сабой часткі прыказак з левай і правай калонак.

| | |
|---|---|
| **1)** Родная мова – як матчына песня: | **А** без яго не пражывеш. |
| **2)** Мова – душа народа: | **Б** як крынічная вада: чыстае і жывіць. |
| **3)** Хто сваю мову шануе – | **В** грэе сэрца, як сонейка. |
| **4)** Роднае слова – | **Г** той сябе не загубіць. |
| **5)** Чужая мова вучыць, | **Д** а родная – жывіць. |
| **6)** Слова роднае – як хлеб надзённы: | **Е** няма мовы – няма народа. |

*(2 балы)*

## Тэкст Б

М. Танк

### Родная мова

З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц.
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, –
Ты выткана, дзіўная родная мова.

Няма на зямлі таго шчасця і гора,
Якога б ты нам перадаць не магла.
Няма такіх нетраў, глыбокага мора
І гор, праз якія б ты не правяла
Мяне на радзіму, туды, дзе сягоння
Стаіць акрываўлены вораг з пятлёй
Над спаленай хатай, над родным загонам,

Над будучыняй і песняй маёй –
Над тым, што было і што век будзе вольным.

Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім
Праз цемру і годы змаганняў суровых.
Калі ж ападзе і развеецца дым
І нівываскросшыя закаласяцца, –
Ізноў прашуміш ты вясновым дажджом,
Ізноў зазвініш ты у кожнай у хаце,
Цымбалам дасі іх сарэбраны гром
І вусны расквеціш усмешкай дзіцяці.

**Пытанні да тэксту**

**16.** Да якога тэматычнага віду лірыкі адносіцца верш?

_______________________________________________

*(1 бал)*

**17.** Назавіце цэнтральны вобраз верша.

_______________________________________________

*(1 бал)*

**18.** Аднавіце сказы, устаўляючы на месцы пропускаў неабходныя словы.

Верш Максіма Танка “Родная мова” з’яўляецца глыбокім і 1) ________________ __________________ роднай беларускай мове. Паэт не проста адлюстроўвае яе 2) __________________, але і падкрэслівае яе 3) _______________ у фарміраванні 4) __________________, культуры і 5) ________________ свету народа.

*духоўнага, прыгажосць, асобы, гімнам, эмацыйным, значнасць*

*(2 балы)*

**19.** Сфармулюйце тэму кожнай страфы верша.

**1)** Тэма 1-й страфы – ..................................................................................................

**2)** Тэма 2-й страфы – ..................................................................................................

**3)** Тэма 3-й страфы –...................................................................................................

*(2 балы)*

**20.** У якім радку гаворыцца пра здольнасць мовы пераадолець любыя перашкоды?

_______________________________________________

_______________________________________________

*(1 бал)*

**21.** Выпішыце радкі верша, у якіх падкрэсліваецца здольнасць мовы перадаваць усе чалавечыя перажыванні.

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**22.** Выпішыце радок з метафарай, якая перадае ўпэўненасць і аптымізм адносна будучыні роднай мовы.

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**23.** З апошняй страфы выпішыце эпітэт, з дапамогай якога сцвярджаецца бессмяротнасць мовы.

______________________________________________

*(1 бал)*

## RAŠTO DARBAS *(30 taškų)*

- **Выберыце адну з прапанаваных тэм і напішыце сачыненне-разважанне або інтэрпрэтацыю твора. Аб'ём пісьмовай работы — мінімум 300 слоў**. У чыставіку падлічыце словы, пазначце рыскай мяжу 300 і запішыце колькасць слоў на палях.

- **У сачыненні спасылайцеся як мінімум на два творы мастацкай літаратуры**. Хаця б адзін твор павінен быць з пералічаных у спісе для абавязковага чытання (Спіс абавязковых для чытання твораў: М. Гусоўскі. „Песня пра зубра“, В. Дунін-Марцінкевіч. „Пінская шляхта“, Ф. Багушэвіч. “Тралялёначка“, М. Багдановіч. „Апокрыф“, Цётка. „Успаміны з паездкі ў Фінляндыю“, А. Гарун. „Пан Шабуневіч“, Я. Купала. „Раскіданае гняздо“, Я. Колас. „У палескай глушы“, М. Гарэцкі. „У чым яго крыўда?“, К. Чорны. „Лявон Бушмар“, І. Мележ. „Людзі на балоце“, К. Караткевіч. „Каласы пад сярпом тваім“, В. Быкаў. „Аблава“, С. Алексіевіч. „Чарнобыльская малітва“, А. Дудараў. „Князь Вітаўт“).

- **У інтэрпрэтацыі разгледзьце тэму, праблематыку, элементы паэтыкі тэксту** (з тлумачэннем іх функцыі).

- **У працы (як у сачыненні, так і ў інтэрпрэтацыі) спасылайцеся на выбраныя кантэксты** (напрыклад, літаратурныя, біяграфічныя, гістарычныя, сацыяльныя, культурныя).

### Тэмы сачыненняў

1. У чым сэнс чалавечага жыцця?
2. Якія асаблівасці творчасці У. Караткевіча далі падставы балгарскай даследчыцы Р. Станкевіч назваць пісьменніка “апосталам беларускай духоўнасці”?

## Тэкст для інтэрпрэтацыі

Рыгор Барадулін[1]

### Сакольнік[2]

Успыхнула роднае слова падлёткам
З цёплых далоняў матчынай песні.
Падлётка прыціхлага і нясмелага
Прылашчыў за пазухай хлопчык Максімка.
Вучыў яго вышыні не баяцца,
Крылы свае давяраць
Хмарам. Вятрам сустрэчным...
Падлётак[3] смялеў і лётаў
У вырай, у край сінявокі,
Што Белаю Руссю зваўся.
Вяртаўся у горад над Волгай –
І пахлі ўздужэлыя крылы
Самлелым аерам Наддзвіння,
Трывожнай зарой Наднямоння,
І косамі свіцязянак...
Як здзіўлены быў блакіт,
Калі з пляча юнака Максіма
Да сонца вольны птах ускрыліў –
З ім цяжка было сагнацца
І ўладарам захмар'я.
Паклон табе, горды сакольнік
Беларускага крэўнага слова,
Беларускага вечнага слова,
Што ты заручыў яго з небам.
Дзякуй,
Максім Багдановіч!

---

[1] Рыгор Барадулін (24 лютага 1935 – 2 сакавіка 2014) – беларускі паэт, эсэіст і перакладчык.
[2] Сакольнік – той, хто даглядае лоўчых птушак, абучае іх і палюе з імі.
[3] Падлётак – птушаня, якое толькі пачынае лятаць.

## JUODRAŠTIS

NEPAMIRŠKITE ATSAKYMŲ PERKELTI Į ATSAKYMŲ LAPĄ